**Шаблон карткі**

| Траекторыя палёту дрона | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Вуснае лічэнне | Заданне №1 | Заданне №2 | Заданне №3 | Заданне №4 | Заданне №5 |
| «Дэтэктар хлусні» | «Маршруты нашых супрацоўнікаў» | «Шыфроўка» | «Аддзел статыстыкі» | «Падбяры ключык» | «Дапамажы бабулі Алене» |
| | | | | | |

*Дата поступления в редакцию: 18.04.2025*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ ВУЧЭБНАГА ЗАНЯТКА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ "НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ" (НАВУЧАННЕ ЧЫТАННЮ) У I КЛАСЕ ПА ТЭМЕ "ЗАМАЦАВАННЕ ВЫВУЧАНАГА МАТЭРЫЯЛУ. ЧЫТАННЕ СЛОЎ З ЛІТАРАЙ *Б*"

*Рабчаева Алена Іванаўна*

**Мэта** — абагульненне ведаў вучняў пра вывучаныя літары і гукі, іх характарыстыкі.

**Задачы:**

замацоўваць уменне чытаць склады і словы з літарай *Б/б* на аснове асвоеных вучнямі спосабаў дзеянняў;

арганізаваць назіранні за парнымі звонкімі / глухімі гукамі [б] — [п], [б'] — [п'];

садзейнічаць узнікненню ў вучняў цікавасці да чытання тэксту пра бабулю, дапамогу ёй і клопат пра яе;

выхоўваць дысцыплінаванасць, культуру зносін у працэсе вучэбнага ўзаемадзеяння.

**Абсталяванне:** асноўны вучэбны дапаможнік[1], дадатковы вучэбны дапаможнік[2], малюнкі "мост" і "ручнік", выявы Бома і Біма, кошыкі, прадметныя малюнкі з выявай прадметаў, у якіх ёсць гукі [б] і [б'], карткі літар, складоў, апорныя словы да тэксту, рознакаляровыя лямпачкі для ацэнкі і рэфлексіі.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны этап.**

Празвінеў званок і змоўк,
Пачынаем мы ўрок.

З якім настроем пачынаем урок? У вас на партах ляжаць рознакаляровыя лямпачкі. Зялёная лямпачка абазначае цудоўны настрой, жоўтая — добры, спакойны, чырвоная — сумны. Падыміце лямпачку патрэбнага колеру. Будзем старацца працаваць так, каб ва ўсіх да канца ўрока быў цудоўны настрой.

**II. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.**

Паглядзіце на дошку.

Разгадайце рэбус.

Назавіце словы.




Хто такі памочнік? *(Той, хто памагае каму-небудзь у нейкай справе).*

А вас называюць памочнікамі? Хто і калі вас так называе? *(Адказы вучняў).*

Сёння мы з вамі замацуем веды пра вывучаныя літары і гукі, будзем чытаць словы, сказы і тэксты з імі. На ўроку пагаворым і прачытаем пра тых, хто прыходзіць на дапамогу іншым людзям.

А вы жадаеце стаць маімі памочнікамі?

**III. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

3.1. Паўтарэнне вывучаных літар.

Успомнім вывучаныя літары і гукі, якія яны абазначаюць. Звярніце ўвагу на карту горада літар (малюнак 1).

М., ідзі да дошкі, зараз ты будзеш маім памочнікам. Твая задача — выбраць вывучаную літару на карце горада літар, а задача астатніх — хорам назваць гукі, якія гэта літара абазначае.

А зараз я выбіраю літару, М. называе гукі. Астатнія, ўважліва слухайце і пляскайце ў далоні, калі гукі названы правільна.

3.2. Замацаванне паняцця пра цвёрдыя і мяккія

[1]Свірыдзенка, В.І. Буквар: вучэбны дапаможнік для ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. — Мінск, 2024. — 184 с.

[2]Свірыдзенка, В.І. Спадарожнік буквара: дапаможнік для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. — Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2021. — 202 с.




Малюнак 1

гукі.

Адкажыце, якія літары ўказваюць на мяккасць папярэдняга зычнага *(е, ё, ю, я, і)*, а якія — на цвёрдасць *(а, о, у, э, ы)*. А вось нашы памочнікі Бім і Бом. Толькі сёння дапамога неабходна ім самім. Дапаможам нашым сябрам?

3.3. <u>Гульня “Раскладзі ў кошыкі”.</u>

Бім і Бом прынеслі кошыкі і просяць вас дапамагчы раскласці малюнкі ў кошыкі. Калі ў слове на малюнке ёсць гук [б], кладзём яго ў кошык Бому, калі гук [бʼ], тады Біму (малюнак 2).

*Бяроза, лебедзь, сабака, голуб, яблык, верабей, бульба, цыбуля, аўтобус, кабачок, гарбуз, рыба.*



Малюнак 2. — Узор выканання задання

3.4. Адпрацоўка навыку чытання складоў і слоў.

Гульня “Горкі” (на дошцы прымацаваны карткі).

БУ СЫ БА БАН Бі

БА ЛЯ РЫ РА КА НА

Прачытайце вочкамі, па ланцужку. А зараз папрацуем у парах. Знайдзіце і прачытайце словы ў ланцужку складоў *(бабуля, лясы, сыры, рыба, барабан, банка, кабіна)*. Растлумачце значэнне знойдзеных слоў.

Адзін вучань з пары паказвае слова на дошцы, тлумачыць яго значэнне (малюнак 3).




Малюнак 3. — Узор выканання задання

<u>Самаацэнка “Лямпачкі”.</u>

Зараз ацэнім сваю работу. У каго ўсё атрымалася, падыміце зялёную лямпачку, у каго былі цяжкасці — жоўтую, у каго многае не атрымалася — чырвоную лямпачку.

А зараз устаньце тыя, у каго сусед быў добрым памочнікам. Цудоўна!

Але не толькі людзі могуць сябраваць і дапамагаць адно аднаму, але і гукі. Зараз мы пра гэта даведаемся.

<u>Гульня “Чуйныя вушкі”.</u>

Разгарніце падручнік на старонцы 110 падручніка. Якая літара стаіць у першым радку складоў з галоснымі? *(Б)*. А ў другім радку? *(П)*. Закрыйце вушы далонямі і вымавіце гукі [б], [п], паслухайце, ці ёсць голас. Якія гэта гукі? *(Гук [б] звонкі зычны, [п] глухі зычны)*.

Чытаем напаўголаса слупкі складоў з гэтымі гукамі *ба, па; бо, по, ...* закрыўшы вушы далонямі.

Закрыйце вушы далонямі і вымавіце гукі [бʼ], [пʼ]. Якія гэтыя гукі? *(Звонкі зычны [бʼ] і глухі зычны [пʼ])*.

Чытаем напаўголаса слупкі складоў з гэтымі гукамі *(бі, пі; бя, пя ...)*, закрыўшы вушы далонямі, паслухайце, ці ёсць голас

Гукі [б] — [п] і [бʼ] — [пʼ] сябруюць і ўтвараюць пары па звонкасці — глухасці.

<u>Гульня “Востры зрок”.</u>

Адшукайце ў воблаку слоў[3] склады, якія сябруюць адзін з другім і ўтвараюць пары па звонкасці — глухасці. Працуйце ў пары (малюнак 4).

<u>Самаацэнка “Лямпачкі”.</u>

Ацаніце работу пары.

3.5. Адпрацоўка навыку чытання слоў.

*Чытанне слоў у слупках, с. 110.*

Чытае першы слупок слоў.

[3]Дэманструецца на картках.




Малюнак 4. – Воблака слоў

Якія з гэтых слоў называюць адзін прадмет, а якія – многа?

Які гук вымаўляецца на канцы слова *суп*?

Паслухайце ўважліва, як трэба правільна чытаць словы *зуб, грыб (зу[п], гры[п])*.

Які гук пачулі на канцы гэтых слоў? *([п])*.

Сапраўды, калі на канцы слоў літара ***б***, то чуем не звонкі гук [б], а яго сябра – глухі гук [п]. Такая з'ява ў беларускай мове называецца аглушэнне.

Яшчэ раз правільна прачытайце ўсе словы першага слупка.

Чытаем другі слупок слоў.

Як адрозніваюцца па значэнні словы *рэпа – рэпка, рыба – рыбка*? *(Рэпа вялікая, рэпка маленькая)*.

Паслухайце ўважліва, як трэба правільна чытаць словы рыбка, бабка. Які гук пачулі ў сярэдзіне слоў рыбка, бабка? *([п])*.

Яшчэ раз правільна прачытайце словы ў другім слупку. Працуем ў парах.

<u>Узаемаацэнка "Лямпачкі".</u>

Ацаніце правільнасць чытання суседа. У каго не было памылак пры чытанні, падыміце зялёную лямпачку, у каго былі памылкі – жоўтую, у каго многа памылак – чырвоную лямпачку.

Гук [п] дапамагае правільна вымавіць словы з літарай ***б*** у сярэдзіне і на канцы слоў. Мы ўжо зрабілі шмат работы. Зараз я дапамагу вам як след адпачыць.

3.6. <u>Фізкультхвілінка.</u>

*Пятрусь пілуе дровы з татам.*
*Наташа корміць куранятак.*
*Алена з мамай грады поле.*
*Падлогу ў хаце мые Поля.*
*А я дык граю на дудзе.*
*Няхай работа лепш ідзе.*
*Раз, два, тры, чатыры, пяць –*
*Тупаем нагамі.*
*Раз, два, тры, чатыры, пяць –*
*Пляскаем рукамі.*
*Раз, два, тры, чатыры, пяць –*
*Будзем нахіляцца.*
*Раз, два, тры, чатыры, пяць –*
*Сядзем зноў займацца.*

А якую дапамогу вы аказваеце сваім родным?

3.7. Назіранне за амонімамі[4].

Разгледзьце прадметныя малюнкі на с. 110.

Прачытайце словы пад імі. Каго мы называем словам бабка? *(Бабулю)*.

Што яшчэ называем словам бабка? З чаго гатуюць страву бабку? *(З дранай бульбы)*.

Як па-іншаму называецца грыб бабка ці абабак? *(Падбярозавік)*.

Паслухайце загадку[5].

Яшчэ пра якую бабку прыгадваецца ў загадцы? *(Бабка – сталёвае кавадла для кляпання касы)*.

Мы заўважылі, што ў мове сустракаюцца словы, якія вымаўляюцца і пішуцца аднолькава, аднак розныя па значэнні. Таму трэба быць уважлівымі пры сустрэчы з такімі словамі.

3.8. Чытанне тэксту "Любімыя ўнукі".

<u>Падрыхтоўка да ўспрымання тэкста.</u>

Зараз утварыце групы. Паслухайце і адгадайце загадку.

*Задача вучняў групы – з картак-літар скласці слова.*

Ва ўсіх груп атрымалася слова – адгадка ***блін***.

Чаму на гэтым тыдні кожны дзень трэба есці бліны? *(Масленічны тыдзень)*. Масленіца – гэта апошняе зімовае свята. Свята сустрэчы зімы з вясною. Яно сьвяткуецца на працягу тыдня і напоўнена гульнямі і забавамі, частаваннямі блінамі.

Хто з вас любіць бліны, устаньце.

Хто вам гатуе бліны?

Зараз мы будзем чытаць тэкст, дзе нам сустрэнецца гэтая страва.

Нашы вочкі таксама ўмеюць маляваць круглыя блінцы.

3.9. Фізхвілінка для вачэй.

| | |
|---|---|
| Вочкі нашы адпачнуць. | (заплюшчваюць вочкі) |
| Глыбей трэба ўдыхнуць. | (глыбокі ўдых, вочкі заплюшчаны) |
| Па крузе вочкі пабягуць, | (вочы расплюшчаны, рух вочкамі па гадзіннікавай стрэлцы) |
| Блінцоў круглых напякуць, | (вочы расплюшчаны, рух вочкамі супраць гадзіннікавай стрэлкі) |
| Шмат разоў яны міргнуць, | часта міргаюць вачыма |
| Зноўку працаваць пачнуць. | (вочкі расплюшчаны, на тварах шырокія ўсмешкі) |

<u>Прыём "Прагноз".</u>

Прачытайце вачыма назву тэкста. Пра каго будзе размова ў тэксце?

3.10. Першаснае ўспрыманне твора "Любімыя ўнукі".

Паслухайце тэкст і падумайце, ці спраўдзіліся нашы меркаванні?

*Чытанне твора настаўнікам.*

3.11. Праверка першаснага ўспрымання.

Хто героі тэксту? Чым уразіў тэкст?

3.12. Другаснае чытанне твора вучнямі і аналіз.

[4]Без ужывання тэрміна.

[5]Размешчана на с. 110 «Спадарожніка буквара».

Прыём "Чытанне з прыпынкамі"[6].

Пачынаем чытаць па сказе. Будзьце ўважлівыя, чытайце правільна, старайцеся зразумець прачытанае.

Хто такая Вера?[7]

Колькі ўнукаў у бабулі Веры? *(4)*[8].

Якія імёны ва ўнукаў бабулі?[9]

Як бабуля адносіцца да ўнукаў? *(Любіць іх.)*

Чым былі занятыя ўнукі? *(Яны дапамагалі бабулі.)*

Што рабіў Віктар? *(Палівал яблыні.)* Што рабіў Ігар? *(Карміў карову.)* Чым займаліся Барыс і Іван? *(Майстравалі лаўку.)*

Пакажыце на малюнках Барыса *(Івана, Віктара, Ігара)*.

Як ласкава магла назваць бабуля хлопчыкаў? *(Бора, Ваня, Віця)*.

Ці можна назваць хлопчыкаў памочнікамі? Чаму?

Ці можна назваць унукаў клапатлівымі? Чаму?

Ці можна назваць бабулю Веру клапатлівай? Чаму?

Як паклапацілася пра ўнукаў бабуля? *(Яна нагатавала ім бліноў.)*

Ці хочаце вы даведацца, што было далей?

Чытаем працяг тэксту. Працуем у пары, чытаем па сказе да канца. Будзьце ўважлівыя, чытайце правільна, старайцеся зразумець прачытанае.

Узаемаацэнка "Лямпачкі".

Ацаніце, ці правільна чытаў сусед.

IV. Абагульненне і сістэматызацыя ведаў.

Гульня «Так — не».

Калі выказванне правільнае, падымаем зялёную лямпачку, калі не — чырвоную[10] (малюнак 5).




Малюнак 5. – Узор выканання задання

Выказванні.

1.Унукі былі бабулінымі памочнікамі. *(Так)*.

2.Бабуля частавала ўнукаў пірагамі. *(Не)*. А чым? *(Блінамі)*.

3. Іван еў бліны са смятанай. *(Так)*.

4. Барыс еў бліны з мясам. *(Не)*. А з чым? *(З варэннем)*.

5. Віктар еў бліны з мясам. *(Так)*.

6. Ігар любіць бліны з тварагом. *(Так)*.

7. Бабуля ела бліны з мёдам. *(Не)*. А з чым? *(З маслам)*.

Самаацэнка "Лямпачкі".

Ацаніце сваю работу. У каго ўсе адказы былі правільныя — зялёная лямпачка, у каго 1–2 памылкі — жоўтая, тры і больш памылак — чырвоная.

Як адчувалі сябе бабуля і ўнукі за сталом? *(Ім было прыемна быць усім разам, яны былі задаволеныя.)*

Якая кулінарка бабуля? Чаму вы так думаеце? Прачытайце адпаведны сказ тэксту. *(Усім смачна.)*

Прачытайце апошні сказ. Ці згодныя вы з аўтарам? Дакажыце сваю думку. *(Хлопчыкі дапамаглі бабулі, а яна іх смачна пачаставала. Калі дапамагаеш бабулі, ёй прыемна. Унукі паклапаціліся пра бабулю, а бабуля — пра ўнукаў. Быць памочнікам — добрая справа. Трэба клапаціцца пра сваіх родных)*.

Як вы ласкава называеце сваю бабулю? *(Бабуся, бабулька, бабка, бабулечка)*.

Яна частуе вас блінамі? Хто дапамагаў бабулі гатаваць бліны? Раскажыце пра гэта.

З чым вы любіце есці бліны?

Кірыліца задае вам пытанні. Прачытайце.

Раскажыце, як вы клапоціцеся пра сваіх родных. Як праяўляеце ветлівасць?

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

Дзеці, сёння вы навучыліся чытаць склады, словы з літарай б, змаглі прачытаць цікавы тэкст.

Што было цяжкім на ўроку?

Самаацэнка "Лямпачкі".

Ацаніце сваю работу. Прымацуйце на дошку свае лямпачкі. У каго ўсё атрымалася, прымацуйце зялёную лямпачку, у каго былі цяжкасці — жоўтую, у каго многае не атрымалася — чырвоную лямпачку.

***VI. Рэфлексія. Падзяка.***

Прапаную вам выбраць і сказаць «дзякуй» за супрацоўніцтва на ўроку толькі аднаму аднакласніку. Растлумачце, чым ён дапамог.

Я таксама кажу вам «дзякуй» за актыўную працу і дапамогу на ўроку.

Вы вельмі стараліся, былі добрымі памочнікамі, таму ў нас сёння ўсё атрымалася.

*Дата поступления в редакцию: 18.04.2025*

[6] Пасля чытання кожнага сказа высвятляецца разуменне таго, аб чым чыталі.
[7] Дэманструецца картка са словам.
[8] Лічба размяшчаецца на дошцы.
[9] Імёны хлопчыкаў вывешваюцца на дошцы.
[10] На працягу гульні насупраць імён на дошцы прымацоўваюцца карткі са словамі смятана, тварог, мяса, варэнне, масла.